# УЖЫВАННЕ ЛІЧЭБНІКА ДЛЯ АБАЗНАЧЭННЯ ЧАСУ

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫ ЗАНЯТАК ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў VI КЛАСЕ

**Л. М. Цярлецкая,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі,
СШ № 12 г. Пінска

Факультатыўны занятак з'яўляецца апошнім па тэме "Лічэбнік". Занятак пабудаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў і ступені сфарміраванасці ў іх агульнавучэбных уменняў. Для вырашэння пастаўленых задач вучням прапанаваны разнастайныя заданні. Вучэбны матэрыял для занятка адабраны з метадычных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры.

**Мэта:** мяркуецца, што ў канцы факультатыўнага занятка вучні змогуць дарэчна карыстацца лічэбнікамі для абазначэння часу ў беларускай мове.

**Задачы:**

1. Актуалізаваць веды пра лічэбнік як самастоўную часціну мовы, сэнсавыя і граматычныя прыметы, асаблівасці змянення і адметнасць ужывання ў беларускай мове.
2. Садзейнічаць развіццю лінгвістычнага мыслення вучняў.
3. Садзейнічаць выхаванню пачуцця павагі да роднага слова.

**Абсталяванне:**

1. Рабочыя лісты ўрока з заданнямі.
2. Запісы на дошцы.
3. Табліца.
4. Карткі з запісамі часу.
5. Выстава гадзіннікаў.
6. Скарбонка народнай мудрасці (народныя выслоўі).

**Эпіграф**: Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць.

## Ход занятка

1. **Арганізацыйны момант.**

**Настаўнік.** У якасці эпіграфа да заняткаў узята народнае выслоўе "Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць". Яно адрасуецца вам. Вы сапраўды такія, і я з задавальненнем сёння дапамагу вам раскрыць новыя таямніцы нашай роднай мовы.

2. **Актуалізацыя ведаў.**

**Настаўнік**. Над гэтым заданнем вы будзеце працаваць разам, бо нездарма ж гавораць, што адна галава добра, а дзве – лепш. Хачу папрасіць у вас дапамогі. У мяне рассыпаліся карткі, на якіх напісаны словы. Дапамажыце іх сістэматызаваць (каля дошкі працуюць двое вучняў).

Словы на картках: дзясяты, сямідзясяты, трыццаць другі, дваццаць пяць, адна пятая, восемсот, два, чацвёра, паўтара, паўтараста, патроіць, дзясятка, двойчы, двойка.

| Разрад | | Паводле складу | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Простыя | Складаныя | Састаўныя |
| Парадкавыя | | | | |
| Колькасныя | Цэлы лік | | | |
| | Дробавыя | | | |
| | Зборныя | | | |

Вучні тлумачаць выкананае заданне.

**3. Асноўны этап.**

1. Паглыбленне ведаў.

**Настаўнік.** Мэта факультатыўных заняткаў – не толькі замацоўваць веды, але і пашыраць іх у межах тэмы. І ў тым, каб удасканальваць уменне карыстацца лічэбнікамі для абазначэння часу ў беларускай мове. Звярніце ўвагу на тое, што ў беларускай і рускай мове слова **час** мае рознае значэнне. Беларускае **час** на рускую перакладаецца, як “время”, а рускае **час** па-беларуску – “гадзіна”.

У беларускай мове існуе некалькі канструкцый для выражэння дакладнага часу. На пытанне: “Якая (каторая) гадзіна? Колькі часу? Колькі зараз?” – можам даць адказ: “Зараз восем гадзін трыццаць хвілін” або папросту “Зараз восем трыццаць”. Гэта так званы “электронны” час. Паралельна ўжываецца форма *палова (палавіна) на дзявятую* (пад уплывам польскай мовы) *і палова дзявятай*. Калі гэта, напрыклад, 12.00, 13.00 і г.д., мы кажам: дванаццаць нуль-нуль, дванаццаць (роўна), дванаццаць апоўдні, поўдзень; трынаццаць нуль-нуль, гадзіна (роўна), гадзіна дня.

Дарэчы, па-беларуску можна сказаць не толькі хвіліна, але і мінута – гэта поўныя сінонімы, аднак ужывання слова *мінута* часта пазбягаюць праз яго супадзенне з рускім. Падобная сітуацыя і са словамі *палова – палавіна*. У беларускай мове гэта сінонімы, аднак слова *палова* ўжываецца значна часцей за другі варыянт.

На пытанне “А якой (каторай) гадзіне? У колькі? Калі?” – сёння фактычна маем паралельнае ўжыванне некалькіх формаў, сярод якіх найбольшую папулярнасць набыла канструкцыя з прыназоўнікам а: *сустрэнемся а палове на дзявятую (а палове дзявятай).* Ужываецца таксама форма з у: *у палове на дзявятую (у палове дзявятай).* Можам зноў жа сказаць: *сустрэнемся ў восем трыццаць.*

На пытанне “Як доўга (ідзе, працягваецца…)? Колькі доўжыцца?” – адкажам: паўгадзіны, *дзве з паловай гадзіны*, а таксама *да шостай (гадзіны вечара ці раніцы)* або *да шасці.*

Акрамя дакладнага часу, існуюць таксама формы прыблізнага часу, якія ўтвараюцца пры дапамозе прыназоўнікаў *каля, блізу, пад, перад, пасля, прыслоўя дзесьці*, а таксама шляхам перастаноўкі словаў:

- ✓ Фільм доўжыцца блізу дзвюх гадзін.
- ✓ Каля палутара хвілін яму спатрэбілася, каб выканаць гэта заданне.
- ✓ Мы дамовіліся спаткацца каля ўніверсітэта перад шостай (гадзінай) / перад шасцю (вечара).
- ✓ Госці пачалі збірацца пад шостую вечара.
- ✓ Дзесьці а восьмай раздаліся першыя ўдары грому.
- ✓ Давай сустрэнемя гадзіне а другой (гадзіны ў дзве).
- ✓ Таксама можа выкарыстоўвацца канструкцыя *не больш (не менш) як (за)*: “Мне спатрэбіцца не менш як чвэрць гадзіны, каб адказаць на гэты ліст”.

**2. Слоўнікавая работа**

Суткі – 24 гадзіны

1 гадзіна – 60 хвілін

1 хвіліна – 60 секунд

**3. Гульня “Колькі часу?”**

***Ужыванне парадкавых лічэбнікаў для абазначэння часу***

| |
|---|
| Прыйсці **ў** восем гадзін =<br>= Прыйсці **а** восьмай гадзіне |
| Заняткі пачынаюцца ў 11.05 (**адзінаццаць гадзін пяць хвілін**) =<br>= Заняткі пачынаюцца **ў пяць хвілін дванаццатай** |
| Я прачынаюся ў 7.30 (**сем гадзін трыццаць хвілін**) =<br>= Я прачынаюся **ў (а) палове восьмай** |

Заданне. Адкажыце на пытанні: Колькі зараз? (1 варыянт) і Калі? (2 варыянт). Запішыце як мага больш варыянтаў адказаў словамі:

**12.45**

Колькі? Дванаццаць (гадзін) сорак пяць (хвілін), без пятнаццаці гадзіна, без чвэрці гадзіна.

Калі? У дванаццаць (гадзін) сорак пяць (хвілін), без пятнаццаці гадзіна, без чвэрці гадзіна.

**14.30**

Колькі? Чатырнаццаць (гадзін) трыццаць (хвілін), дзве трыццаць (дня), палова на трэцюю, палова трэцяй.

Калі? А палове на трэцюю, а палове трэцяй, у палове на трэцюю, у палове трэцяй, у чатырнаццаць (гадзін) трыццаць (хвілін), у дзве трыццаць (дня).

**19.25**

Колькі? Дзевятнаццаць (гадзін) дваццаць пяць (хвілін), сем дваццаць пяць, дваццаць пяць (хвілін) на восьмую / дваццаць пяць (хвілін) восьмай.

Калі? У дзевятнаццаць (гадзін) дваццаць пяць (хвілін), у сем дваццаць пяць, у дваццаць пяць (хвілін) на восьмую, у дваццаць пяць (хвілін) восьмай.

**21.03**

Колькі? Дваццаць адна гадзіна тры хвіліны, дваццаць адна нуль тры, дзевяць гадзін тры хвіліны, тры хвіліны на дзясятую, тры хвіліны дзясятай.

Калі? У дваццаць адну гадзіну тры хвіліны, у дваццаць адну нуль тры, у дзевяць гадзін тры хвіліны, у тры хвіліны на дзясятую, у тры хвіліны дзясятай.

**00.50**

Колькі? Дванаццаць (гадзін) пяцьдзясят (хвілін) ночы, без дзесяці гадзіна (ночы).

Калі? У дванаццаць (гадзін) пяцьдзясят (хвілін) ночы, у нуль гадзін пяцьдзясят хвілін, без дзесяці гадзіна (ночы).

**01.00**

Колькі? Гадзіна нуль-нуль (ночы), гадзіна роўна.

Калі? А першай (гадзіне) ночы, у гадзіну нуль-нуль, у гадзіну ночы.

**Зрабіце з дакладнага часу прыблізны:**

Сустрэнемся ў 15.00. – Сустрэнемся каля трох дня, блізу трох, дзесьці а трэцяй, гадзіне а трэцяй, гадзіны ў тры, пад трэцюю, перад трэцяй, пасля трэцяй.

Праграма ідзе 30 хвілін. – Праграма ідзе каля трыццаці хвілін, каля паўгадзіны, блізу паўгадзіны

**4. Фізкультхвілінка**

Каб уважлівымі быць,
Трэба трошкі адпачыць.
Раз – падняцца, усміхнуцца,
Два – сагнуцца, разагнуцца.
Галаву на тры падняць, на чатыры –
паківаць.
Пяць – рукамі памахаць.
Шэсць – паспешліва прысесці,
Сем – за парты ціха сесці.
На лік восем – варта знаць –
Сшыткі ўсім падраўнаваць.
Дзевяць – кніжку ў рукі ўзяць.
Дзесяць – будзем працаваць!
Мы цікава адпачылі і лічэбнік паўтарылі.

**5. Рубрыка “Будзільнікі і гадзіннікі” (апераджальнаяе заданне, выступае вучань)**

“Гадзіннікі” і “будзільнікі” нашых продкаў

А як жа жылі нашы продкі без гадзіннікаў? Як вылічвалі час і па якіх арыенцірах вызначалі яго? Старыя людзі даюць адказ: “Па месяцы і зорках, па сонцы і па пеўнях”.

Вечарамі, калі мужчыны плялі лапці, а жанкі пралі ніткі з кудзелі ці ўпарадкоўвалі тыя ж ніткі і заседжваліся да ночы, то існавала мерка часу: “першыя пеўні” – яшчэ не позна, “сядзець да трэціх пеўняў” – вельмі позна заседжвацца. Але раніцай, устаючы вельмі рана, казалі: “усталі з пеўнямі”. Некаторыя выслоўі – меркі часу дайшлі да нашых дзён: з першымі пеўнямі, класціся з пеўнямі, прасядзець да пеўняў. Хаця зімой, вядома, не заўсёды світае, як певень спявае.

Дарэчы, у вельмі даўнія часы пеўня называлі “кур” (так пісалася ў старажытных летапісах).

У сонечныя дні нашы продкі “звяралі” час па сонцы. Улік часу быў адвольны: перад захадам сонца, пасля заходу сонца, да ўсходу сонца, з сонцам, у поўдзень. У дзённы час

вызначэнне ішло па цені. Сонца ў зеніце – поўдзень, цень у той час роўны кроку чалавека. Пастухі звычайна гналі кароў днём ў хлявы, вымераўшы свой цень.

Ды і ў наш час можна пачуць даўнія меркі: "Яшчэ сонца не ўзышло, а мы ўжо былі на нагах" – гэта пра ранні пад'ём. Або: "Падняцца з сонцам" – гэта ўжо пад'ём пры ўсходзе сонца. Так жа: "Як сонца на неба, то мы на ногі". А ўжо самы позні пад'ём – пасля ўсходу сонца. Такое ўставанне лічылася гультайскім. Напрыклад: "Сонца ўжо высока, а вы яшчэ лежыцё"; "Праснуўся ў свіныя галасы"; "Кладзецца з курамі, а ўстае са свіннямі".

Нашы продкі не ставілі гадзіннікаў, а замест іх трымалі арыенцір на дрэвы. Казалі: "Ужо сонца ў паўдуба" (ці вяза, ліпы)" – час снедаць. Ці: "Сонца ўжо з-за лесу выйшла, а…", або: "Сонца на елі, а мы яшчэ не елі". Як бачым, і дрэвы былі меркамі часу.

Самыя назіральныя людзі вызначалі арыенцір часу па сонцы і зорках. Але гэта вельмі складаная справа, таму што трэба ўмець разбірацца ў фазах Месяца і ў сузор'ях, а яны, як вядома, пасезонныя. Самым важным "гадзіннікам" начнога часу ў яснае надвор'е ў нашых продкаў было сузор'е Воз (цяпер – Вялікая Мядзведзіца). Як вядома, пры руху нашай планеты стан Вялікай Мядзведзіцы мяняецца і здаецца, што яна варочаецца вакол Паўночнай (Палярнай) зоркі. Вось па стане размяшчэння зорак і каўша сузор'я і вызначалі час.

Вызначалі час і па вышыні маладзіка або поўні над гарызонтам. Важным арыенцірам з'яўлялася сузор'е Сіта. У 12 гадзін ночы яно знаходзіцца на ўсходзе, нізка над небакраем, а ў 5 гадзін ранку – на поўдні. Звычайна ў такі час зімой жанчыны ўставалі, каб прасці ніткі.

**Настаўнік.** Нашы продкі былі людзьмі ашчаднымі, цанілі працу і кожную працоўную часіну. Казалі: "Час не чакае"; "Хвіліна дзень сцеражэ"; "Хто рана ўстае, таму Бог дае, а хто доўга спіць, таму няма ніц"; "Страчанага вясною не купіш" (выказванні змешчаны на дошцы пад назвай "Скарбонка народнай мудрасці"). Зварот да выставы гадзіннікаў.

**6. Гульня "Ці правільна вы размяркоўваеце свой вольны час?"**

Скажыце, колькі прыкладна часу ў суткі вы адводзіце на:

- Падрыхтоўку ўрокаў;
- Прагулку;
- Чытанне цікавай кнігі;
- Заняткі спортам;
- Дапамогу бацькам па гаспадарцы;
- Размовы з сябрамі;
- Прагляд тэлеперадач;
- Сваё хобі;
- Сон.

**7. Час творчасці (клас падзелены на групы)**

1-ая група: Складзіце дыялог паміж сябрамі на тэму "Школа"

2-ая група: Напішыце аб'яву.

3-ая група: Апішыце свой дзень , называючы час і паслядоўнасць падзей.

Абарона адказаў.

**5. Рэфлексія**

Як кожны з вас сёння папрацаваў на занятках?

***Я засвоіў тэму:***

на дзесяць з плюсам;
як свае пяць пальцаў;
сярэдзінка на палавінку;
каша ў галаве;
як ойча наш.

***На занятку я:***

хаваўся за чужыя спіны;
адчуваў сябе як рыба ў вадзе;
сядзеў склаўшы рукі;
не ўдарыў тварам у гразь;
біў лынды;
працаваў на поўную моц.

**6. Падвядзенне вынікаў.**

- Ці дасягнулі мы пастаўленай мэты?
- Ацэнка работы вучняў на занятках.